# У грамадстве або ў чатырох сценах?

## Рэалізаваць патэнцыял кожнага

— Для таго каб інклюзіўная адукацыя запрацавала, мы павінны змяніць стаўленне грамадства (а нярэдка і сваё стаўленне) да дзяцей з інваліднасцю, — лічыць **прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Рэспубліцы Беларусь Рашэд МУСТАФА.** — Калі мне кажуць, што дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця не паспяваюць у школе, я звычайна адказваю: няўжо вы самі былі круглымі выдатнікамі па ўсіх прадметах? Пагадзіцеся, што спецыялістамі ў ядзернай фізіцы становяцца толькі адзінкі з вялікай колькасці выпускнікоў, а хтосьці працуе прадаўцом, бухгалтарам і гэтак далей. Дзіця з асаблівасцямі таксама можа стаць высокакваліфікаваным IT-спецыялістам, перакладчыкам, анлайн-рэкруцёрам ці проста зможа навучыцца чытаць, карыстацца камп'ютарам — кожны ў адпаведнасці са сваім патэнцыялам. Але магчымасць рэалізаваць свой патэнцыял павінна быць у кожнага — і ў звычайнага дзіцяці, і ў «незвычайнага». Пакуль, на жаль, у Беларусі ў адносінах да інваліднасці і інвалідаў пераважае медыцынскі падыход, а патрабуецца — сацыяльны. Мы павінны пабудаваць сістэму інклюзіўнай адукацыі шляхам адаптацыі як асяроддзя, так і зместу вучэбнай праграмы, якая будзе ўлічваць інтарэсы ўсіх удзельнікаў навучальнага працэсу: ад настаўніка да вучняў і бацькоў дзяцей з інваліднасцю. **Каму, як не педагогам, быць першымі ў выкараненні стэрэатыпаў?**

З 2014/2015 навучальнага года ў Беларусі рэалізуецца рэспубліканскі эксперыментальны праект па апрабацыі мадэлі інклюзіўнай адукацыі, у якім прымаюць удзел восем сярэдніх школ з усёй краіны. У бягучым навучальным годзе працуюць 20 эксперыментальных інклюзіўных класаў. Узрастае таксама колькасць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх створана адаптыўнае адукацыйнае асяроддзе. Калі ў 2013/2014 навучальным годзе іх было 280, то ў 2015/2016 годзе — ужо 951.

— Мы разумеем, як шмат нам трэба зрабіць, але гатовыя да зменаў і разумеем іх неабходнасць, — запэўнівае **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА.** — Патрабуецца распрацоўка прынцыпова новых дакументаў, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу з улікам інклюзіўных падыходаў. Пры інклюзіі трэба не вучняў з тымі ці іншымі цяжкасцямі ў навучанні адаптаваць пад патрабаванні стандартнай школы, а рэфармаваць установы адукацыі і шукаць іншыя педагагічныя падыходы, каб было магчымым найбольш поўна ўлічваць асаблівыя адукацыйныя патрэбы ўсіх навучэнцаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Цаніць унікальнасць

**Начальнік аддзела спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніна ЗМУШКО** ўпэўнена, што нельга толькі крышачку палепшыць сістэму і пакінуць пад новай шыльдай ранейшыя падыходы і змест. **Інклюзіўная адукацыя — гэта, найперш, новы светапогляд,** сістэма іншых адносін, дзе прыярытэтам з'яўляюцца не акадэмічныя поспехі вучня, а фарміраванне здольнасці жыць у грамадстве, дзе прызнаецца і паважаецца разнастайнасць, цэніцца ўнікальнасць кожнага чалавека.

— У цэнтры нашай увагі павінны быць не дэфекты дзіцяці, а яго патэнцыял і магчымасць сацыялізацыі. Аднак для сістэмы адукацыі, у тым ліку і спецыяльнай, гэта няпросты пераход, — канстатуе Антаніна Змушко. — Работа па фарміраванні талерантнасці, інклюзіўнай культуры з'яўляецца, мабыць, адной з найбольш складаных задач. Інклюзія ў адукацыі ставіць шмат неадназначных пытанняў і праблем, над вырашэннем якіх мы працуем, у тым ліку і выкарыстоўваючы багаты міжнародны вопыт

— Калі ў школе асобна арганізаваны заняткі асаблівых і звычайных дзяцей — гэта не інклюзіўнае навучанне. Нават калі на занятках вучні знаходзяцца разам, але пры гэтым не створаны неабходныя ўмовы для іх сумеснага эфектыўнага навучання, то гэта таксама не інклюзіўнае навучанне, — тлумачыць **саветнік па пытаннях інклюзіўнай адукацыі рэгіянальнага бюро ЮНІСЭФ Нора ШАБАНІ.**

## Эфект ад супрацоўніцтва

У Расіі інклюзіўная адукацыя на заканадаўчым узроўні ўпершыню была замацаваная яшчэ ў 2012 годзе. У новым Законе «Аб адукацыі» прапісалі правы і абавязкі бацькоў і дзяцей пры атрыманні інклюзіўнай адукацыі.

— Мы працуем у гэтым кірунку ўжо пяць гадоў, і ў нас з'яўляецца ўсё больш школ, дзе робіцца ўсё для таго, каб інклюзія перастала быць проста лозунгам, а стала рэальнасцю, — расказаў **дырэктар Інстытута карэкцыйнай педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, акадэмік Мікалай МАЛАФЕЕЎ.** — Разам з тым мы не лічым (ва ўсялякім выпадку на гэты момант), што сетка спецыяльных школ павінна быць згорнутая, што бацькі ці дзеці камусьці штосьці павінныя.



А вось дзяржава абавязана прадастаўляць тыя адукацыйныя паслугі, якія заказваюць бацькі. І калі хтосьці хоча, каб яго дзіця навучалася ва ўмовах не агульнаадукацыйнай, а карэкцыйнай школы — мы павінны ім забяспечыць такую магчымасць. Карэкцыйная педагогіка яшчэ цалкам сябе не зжыла. Затое з'явілася сістэма ранняй дапамогі, якая раней была немагчымая. Дзяржаве яна была непатрэбная, а бацькі не разумелі яе каштоўнасць. Многія і зараз не спяшаюцца прызнаць у свайго дзіцяці праблему, цягнуць з яе канстатацыяй да трох—чатырох гадоў і звяртаюцца да спецыялістаў, на жаль, з вялікім спазненнем. Калі бацькі матываваныя, мы бачым, якія фантастычныя вынікаў можна дасягнуць у першыя тры гады жыцця дзіцяці пры ранняй карэкцыйнай дапамозе. Па-першае — гэта сацыяльны эфект: дасведчанасць бацькоў у пытаннях выхавання і рэабілітацыі свайго дзіцяці дасягае 90—95 працэнтаў. Ад 30 да 35 працэнтаў дзяцей з цяжкімі генетычнымі парушэннямі застаюцца ў сваёй сям'і, тым самым змяншаецца колькасць дзяцей-сірот. Па-другое, рэабілітацыйны эфект: да сямі гадоў у 50—55 працэнтаў дзяцей развіццё набліжаецца да ўзроставай нормы, і яны ідуць вучыцца па агульным стандарце, ім не патрабуецца спецыяльная школа. Такім чынам адзін рубель, укладзены ў рэабілітацыю дзіцяці ў раннім узросце, эканоміць пазней тры рублі.

На думку Мікалая Малафеева, бацькі атрымалі вельмі вялікія правы і гэта добра, але трэба, каб яны разумелі, што ў іх ёсць і абавязкі. Сёння спецыялісты гавораць бацькам: «У вашага дзіцяці ёсць праблема, але толькі вы можаце дапамагчы нам у яе выпраўленні». «Наша з вамі задача — агучыць усе магчымыя шляхі з іх наступствамі, каб бацькі маглі зрабіць усвядомлены выбар. Хацелася б, каб як мага больш дзяцей мелі магчымасць вучыцца ва ўмовах інклюзіі і выходзіць са школы паўнавартаснымі грамадзянамі, абсалютна незалежнымі і здольнымі прымаць самастойныя рашэнні», — дадаў ён.

Дарэчы, знакаміты беларускі педагог, заснавальнік гуманнай педагогікі Леў Выгоцкі яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя сказаў, што **школа для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя (нават пры ўсіх сваіх вартасцях) заключае вучня ў замкнёнае асяроддзе, дзе ўсё прыстасаванае пад дэфекты дзіцяці.** Школа, замест таго каб выводзіць дзіця з гэтага ізаляванага свету, развівае ў ім навыкі, якія вядуць да яшчэ большай ізаляцыі.

## Выхад з ізаляцыі

У Гомельскай вобласці ў інавацыйным праекце па ўкараненні інклюзіўнай адукацыі ўдзельнічаюць два цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі і дзве установы дадатковай адукацыі: Акцябрскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі і Гомельскі абласны палац творчасці дзяцей і моладзі. Прычым гэтыя установы дэманструюць інавацыйны досвед інклюзіі дзяцей, якія маюць множныя парушэнні ў развіцці, у тым ліку расстройствы аўтыстычнага спектру. Удзельнікі праекта папярэджваюць: каб такі досвед насамрэч стаў паспяховым і не сказіў ідэю інклюзіі, трэба загадзя рыхтаваць і дзяцей, і дарослых да таго, што ў іх сацыяльнае і прафесійнае жыццё ўвойдуць людзі з асаблівасцямі ў развіцці.

Напрыканцы навучальнага года ў абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі праводзілася анкетаванне навучэнцаў, якія наведваюць аб'яднанні па інтарэсах. «Чым ты асабіста можаш дапамагчы дзецям з аўтызмам?» — пацікавіліся ў дзяцей. 37 працэнтаў рэспандэнтаў адказалі: «Трэба паспрабаваць зразумець прычыну», а 63 працэнты — «Трэба паспрабаваць пасябраваць з равеснікам, у якога аўтызм». Вось такі вынік усяго аднаго года ўзаемадзеяння.

Дарэчы, у 2008 годзе ў афіцыйным дакуменце ААН было сказана, што **аўтызм стаў адной з самых сур'ёзных праблем у сферы аховы здароўя ва ўсім свеце, нароўні з ракам, дыябетам і ВІЧ/СНІД.** У Польшчы ў 2013 годзе ўрад зацвердзіў Карту правоў людзей з аўтызмам, у якой гаворыцца, што асобы з аўтызмам маюць права на незалежнае, самастойнае і актыўнае жыццё і не могуць падвяргацца дыскрымінацыі.

— Звычайна бездакорны знешні выгляд дзяцей з аўтызмам узмацняе негатыўную рэакцыю на іх навакольных, паколькі «звонку» такія дзеці выглядаюць здаровымі, а бацькоў звычайна абвінавачваюць у тым, што іх дзеці «непаслухмяныя», «разбэшчаныя», «дзіўныя», і гэта прыводзіць да таго, што тыя адчуваюць няёмкасць, сорам і стомленасць, — кажа **дырэктар Дыягнастычна-тэрапеўтычнага цэнтра для дзяцей з аўтызмам Марта ЛУКОЎСКА-АЛМАШЫ.** — Самая частая рэакцыя на дзяцей з аўтызмам і іх сям'ю — ізаляванне і сацыяльная дыстанцыя. Бацькі часцей за ўсё таксама выбіраюць менавіта гэты спосаб для перааддолення стрэсу. Яны ўстрымліваюцца ад сумеснага наведвання грамадскіх месцаў, каб пазбегнуць адмоўнай рэакцыі з боку іншых людзей, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да таго, што ў дзяцей не выпрацоўваюцца навыкі і ўменні правільных паводзінаў у розных сацыяльных сітуацыях. Задачы, пастаўленыя дзяржавай, у значнай ступені вырашаюцца актыўнай дзейнасцю недзяржаўных фондаў і асацыяцый. Адна з такіх арганізацый у Польшчы — асацыяцыя Wspolny Swiat — распрацавала і ўвяла праграму «Я знаёмлюся са светам, свет знаёміцца са мной». Праграма рэалізоўвалася цягам года, і яе вынікам сталі адэкватныя паводзіны дзяцей і моладзі ў розных сітуацыях, у грамадскіх месцах, набыццё ўмення ўстанаўліваць стасункі з дапамогай альтэрнатыўных метадаў камунікацыі (50 працэнтаў удзельнікаў праекта былі людзьмі, якія ўвогуле не размаўляюць, а кантактуюць з навакольнымі людзьмі выключна з дапамогай сімвалаў на карцінках). У бацькоў у значнай ступені зменшыўся стрэс, была заўважана «прыязнасць» персаналу ў «знаёмых» месцах. Такім чынам, першыя вынікі праграмы, скіраванай на набыццё сацыяльных уменняў, аказаліся абнадзейваючымі.

Увогуле ў Еўропе і Амерыцы аўтысты нярэдка займаюцца высокакваліфікаванай працай, і ніхто ўжо не ўспрымае іх як людзей з інтэлектуальнай недастатковасцю. У Беларусі сёння пражывае каля 10 тысяч дзяцей з аўтызмам, пры гэтым лічыцца, што статыстыка адлюстроўвае толькі кожны дзясяты выпадак. Да 90 працэнтаў дзяцей з аўтызмам за мяжой навучаюцца ў сістэме інклюзіўнай адукацыі, а ў нас 90 працэнтаў наогул застаюцца дома. Толькі адзінкі з падлеткаў паступаюць у вучылішчы і, як правіла, іх не заканчваюць.

Ёсць над чым думаць і працаваць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**«Слоўнік талерантнасці», складзены намаганнямі навучэнцаў і педагогаў сярэдняй школы № 1 горада Салігорска. Як казаць правільна:**

**Дзіця з інваліднасцю, а не чалавек з недахопам здароўя, хворы ці непаўнавартасны.**
**Дзіця з парушэннямі зроку, а не сляпое.**
**Дзіця з парушэннямі слыху, а не глухое ці глуханямое.**
**Дзіця з асаблівасцямі развіцця, а не прыдуркаватае.**
**Дзіця ў калясцы, а не паралізаванае, прыкаванае да каляскі.**
**Дзіця з сіндромам Даўна, а не даўн, з хваробай Даўна.**

# ДЗЕСЯЦЬ ГАДЗІН ПА ПОЯС У ЛЕДЗЯНОЙ ВАДЗЕ

## Паляўнічага, які прапаў у Камянецкім раёне, знайшлі ў зарослым калодзежы

**32-гадовы жыхар Камянца пайшоў на паляванне на качку ў другой палове дня, жонцы сказаў, што дома будзе каля сямі вечара. Калі малады чалавек не з'явіўся дома апоўначы, родныя сталі біць трывогу. Першым у міліцыю аб прапажы пляменніка паведаміў яго дзядзька, потым з такой жа заявай патэлефанавала жонка паляўнічага.**

У Камянецкім РАУС стварылі некалькі пошукавых груп, бо сваякі Дзмітрыя З. дакладна не ведалі, куды ён накіраваўся на паляванне. Як паведаміў **намеснік начальніка Камянецкага РАУС Сяргей ПАНАСЮК,** пошукі працягваліся ўсю ноч, і каля чатырох раніцы ў зарослым калодзежы каля вёскі Радасць знайшлі чалавека, які стаяў па пояс у ледзяной вадзе.

Ён патлумачыў, што не заўважыў калодзеж у высокай траве і праваліўся. Выбрацца адтуль самастойна не змог, а мабільны тэлефон на глыбіні сем метраў не лавіў сетку. Яго паляўнічы сабака пабегаў нейкі час вакол, а потым скочыў уніз да гаспадара. Так і сталі чалавек і сабака ў спадзяванні на дапамогу доўгія дзесяць гадзін.

Дзмітрыя шпіталізавалі з дыягназам пераахаладжэнне ў раённую бальніцу. Як расказалі карэспандэнту газеты ў Камянецкай раённай арганізацыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, зараз ён знаходзіцца на лячэнні. А таварышы гавораць, што ў кашулі нарадзіўся. Калі б ён прастаяў у вадзе даўжэй, наступствы для здароўя былі б яшчэ больш сур'ёзныя.

У гэтай арганізацыі таксама наракалі на праблему закінутых калодзежаў. На тым месцы, каля вёскі Радасць Відамлянскага сельсавета, некалі быў хутар. Дом даўно знеслі ці разабралі, а калодзеж застаўся. І такіх калодзежаў па Камянецкім раёне застаецца нямала, сцвярджаюць паляўнічыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Сацыяльны клопат

# Каб абараніць пажылых

**У Мінскай вобласці ў лістападзе і снежні аб любых супрацьпраўных дзеяннях у дачыненні да пажылых можна будзе паведаміць ананімна, скарыстаўшыся паштовай скрыняй. Гэта — сумесная акцыя УУС Мінскага аблвыканкама і Мінскага філіяла «Белпошты».**

— Мы прапануем проста апусціць у паштовую скрыню адпаведнае пісьмовае паведамленне міліцыі — нават без канверта і паштовай маркі. Пасля вымання карэспандэнцыі паштовыя работнікі перададуць такога кшталту лісты або запіскі кіраўніцтву райаддзела ўнутраных спраў для аператыўнай праверкі, — растлумачыў «Звяздзе» **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Аляксандр КІСЕЛЬ.** — Але ў адрасаваных такім чынам пасланнях павінна быць інфармацыя аб тым, якое правапарушэнне здзейснена, па якім адрасе... Прычым такім спосабам да нас могуць звяртацца не толькі самі пажылыя, але і неабыякавыя людзі: суседзі, сваякі, знаёмыя. Усе паведамленні мы будзем правяраць і належным чынам рэагаваць на іх.

Справа ў тым, што пажылыя людзі ў вёсцы не заўсёды маюць магчымасць патэлефанаваць у міліцыю і паведаміць аб правапарушэнні. А паштовыя скрыні ёсць практычна ва ўсіх населеных пунктах, і паштовыя работнікі вымаюць карэспандэнцыю з іх строга па графіку. Ды і пажылым людзям карыстацца паштовай скрыняй звыкла і зручна.

— Мы разлічваем на эфектыўнасць гэтай ініцыятывы і заклікаем грамадзян не заставацца абыякавымі да праблем пажылых людзей, — кажа Аляксандр Кісель. — Да таго ж такім чынам можна паведамляць не толькі аб правапарушэннях. У паштовыя скрыні можна апускаць інфармацыю і аб іншых праблемах пажылых грамадзян.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*